РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ПРАПАЛАВЕННЕ**, дзень, які дзеліць папалам перыяд паміж *Вялікаднем* і *Сёмухай*; чацвёртая серада пасля Вялікадня. Называецца таксама перапалаўная, палавенская, грамавая, градавая серада. Паводле нар. павер'яў, у П. «Хрыстос купаўся і пераплыў цераз мора» ці «Божая Маці пераплывала цераз раку і Ісуса Хрыста сахраняла». Менавіта ад гэтага дня дазвалялася купацца да *Ільі* (2 жніўня) або да *Спаса* (19 жніўня). Палешукі часам святкавалі П., у гэты дзень яны пазбягалі палоць, каб не заліло дажджом і не пабіла градам поле, каб не застала бура на рацэ. У іншых мясцінах забаранялі дакранацца да насення і сеяць, «бо збажына не будзе расці». Але раілі ў гэты дзень садзіць цыбулю, каб яна не атрымалася занадта горкая. Пчаляры, каб раі не адляталі, забівалі на пчальніку тры калы і, прывязваючы да кожнага пучок саломы, прамаўлялі: «Няхай так к калу ўюц-

ца мае пчолкі, як я ўю саломку». Лічылася, што на П. карысна дакранацца да гаспадарчых харчовых запасаў, каб яны павольней спажываліся. Казалі, што дзікія птушкі ў гэты дзень асабліва пільнуюць свае гнёзды, там іх лягчэй злавіць. Існавала павер'е, што калі прасушыць адзенне ў перапалаўную сераду, якая таксама называлася «сухою», то знікне моль. Часам прапалоўным днём называлі *серадапосце*.

*Літ.*: Васілевіч У. Беларускі народны каляндар. Мн., 1993. С. 73—74; Лозка А. Беларускі народны каляндар. Мн., 1993. С. 105; Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 592—593.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ